Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грош.

# НАРОДНАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

**Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:** Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр. Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

**Цана абвестак:** перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№. 5 Вільня, Субота, 7-га жніуня 1926 г. Год I.

## Абарона штодзенных інтарэсау.

З розных кутокў Беларусі мы атрымовываем жальбы:

У мястэчку Кобрыне пры рамоньце царквы работнікі працуюць па 10 — 14 гадзін у дзень; князь Радзівілл ў Стаўпецкім павеце, карыстаючыся сваімі сувязямі з уладай, выганяе людзей пры помачы яе на ладжаную для панскай забавы аблаву; у Баранавіцкім павеце былы жандар, а цяперашні арандатар двара Вакштаўляны—загадывае парабкам працаваць ў нядзелю і б'е непаслухмяных. Ды гэтак без канца!

Гэтыя здарэньні—гэта штодзеннае зьявішча ў жыцьці нашае вёскі. Што рабіць? Дзе шукаць помачы? — вось па якую раду звараючцца людзі.

Мы маем сваю газэту „Беларуская Справа“, у ей мы можам вызсказаць свае балячкі, падзяліцца весткамі аб сваім жыцьці з працоўнымі ўсяе дзяржавы, а то і ўсяго сьвету. І гэта мае бязумоўна аргамаднае значэньне. Газэта даходзіць і заграніцу; які-небудзь ангельскі, ці нямецкі работнік, даведаўшыся аб зьдзеках над працоўным народам Беларусі, сьцісьне кулакі і яшчэ з большай цьвёрдасьцяй змагаецца з буржуазным ладам, які душыць яго і ўвесь сьвет. І, наадварот, барацьба напр. ангельскіх работнікаў дадае нам сілы, бо бачым, што мы не адны, што ўсюды йдзе змаганьне працоўных мас з капіталам.

Есьць у нас і іншы спосаб падаць свой голас: калі зьдзекі робіць адміністрацыя, ці іншыя ўрадавыя органы (толькі ня прыватныя), дык нашы паслы падаюць інтэрпэляцыю ў Сойме, дамагаюцца пакараньня вінаватых. Праўда: ўлада—глухая, калі гавораць ёй аб гвалтах над сялянамі і работнікамі. Большая частка нашых інтэрпэляцыяў астаецца бяз вынікаў, але здараецца, калі скандал ужо вельмі вялікі, што і дасягаюць сваей мэты.

Гэтага, аднак, мала. Не лягчэй ад таго працуючаму народу, што адзін раз там нешта з інтэрпэляцыі выйдзе. Гвалты робяцца штодня, усюды ды пастаянна б'юць і бяруць. Трэба шукаць яшчэ іншых, больш моцных спосабаў абароны.

На ўсім сьвеце працоўныя масы, а ў першы чарод мястовыя работнікі зразумелі, што дзеля абароны сваіх інтарэсаў трэба арганізавацца. Аб гэтым мусім памятаць і мы. Вось жа грамадой, добра з'арганізаваўшыся, нам лягчэй даваць адпор усялякім крыўдам і зьдзекам. Нельга прапусьціць моўчкі ніводнага факту гвалту. Нельга ўступаць ніводнага кроку, бо буржуазія і абшарнікі возьмуць і апошнюю кашулю, калі толькі ня будзем барацца.

Паглядзем хоць-бы той самы выпадак у Кобрыне. Работнікаў змушаюць працаваць панад сілы, а калі яны „збунтаваліся“, дык выгналі іхных правадыроў, і ўсё асталося пастараму! Магло быць і іначай. Калі-б работнікі згаварыліся і ўсе, як адзін, выступілі. калі-б яны паразумеліся з усей ваколіцай, каб ніхто ня йшоў на працу, калі-б сабраліся, зрабілі мітынг і т. д.,—дык кіраўніцтва рамонту царквы—пайшло-б на ўступкі.

Або ў Стоўпцах. Пагналі людзей на аблаву, бо яны пайшлі. А калі-б адмовіліся? Хоч-ня-хоч панам прыйшлося-б самым зганяць ваўкоў, або заплаціць селяніну.

Вось, дзеля кіраўніцтва змаганьнем і патрэбна арганізацыя. Дзеля таго і закладаюцца Гурткі „Грамады“. Гурток, зложаны з найбольш сьвядомых людзей, парадзіць, распарадзіцца, аб'яднае нашы сілы.

Ясна, што Грамада змагаецца ня толькі за тое, каб пан ня гнаў на аблаву. Пакуль істнуе ўлада буржуазіі, пакуль абшарнікі маюць зямлю, а капіталісты фабрыкі, —датуль ня будзе жыцьця народу. Яны будуць дзерці скуру з яго, як дзерлі да гэтага часу.

Мы і змагаемся за ўладу працоўных, за работніцка сялянскі ўрад: толькі пры істнаваньні яго спыняцца ўсе праявы сацыяльнага панаваньня буржуазіі над працоўнымі. І мы адваюем сабе яго, бо народ ня можа жыць пры сучасным ладзе і імкнецца да зьмены яго, толькі ён яшчэ цёмны, нез'арганізованы, ня ўмее даць адпору добра з'арганізаванай ды азброенай буржуазіі.

Арганізуючыся дзеля барацьбы за штодзенныя патрэбы, мы ня толькі дабіваемся паасобных уступак. Мы падгатаўляемся, навучаемся вясьці барацьбу наагул. Нішто само ня робіцца, і нішто ня робіцца з нічога. Народныя масы толькі тагды здабудуць сабе волю, калі яны будуць *умець* змагацца за кожную вось гэткую штодзенную справу. Маючы за сабой арганізацыю і добрую практыту ў барацьбе за малое, — мы будзем падгатоўлены да барацьбы і за вялікае!

# Справа амністыі палітычным вязьням.

### Урад Бартля-Пілсудскага не даець амністыі.

Чытаем у „Trybunie“ № 12:

„Прэм'ер Бартэль у апошняй соймавай прамове, абгаварываючы адносіньне ўраду да нац. меншасьцяў, што справы аб праступленьнях, выплываючых у пераважаючай меры, або выключна з палітычных, нацыянальных і рэлігійных прычын, ды выкананых да 1/IV—1923 году,—урад маніцца зьліквідаваць шляхам індывідуальнага памілаваньня на аснове прапазіцыі пракуратуры ў кожным паасобным выпадку.

Якая запраўдная вартасьць вышэйсказанага? Ці на аснове гэтага тысячы палітычных вязьняў беларусаў і ўкраінцаў атрымаюць волю? —Дзе там, саўсім не!

Маема цяпер палову 1926 г., урад-жа абяцуе „зьліквідаваць справы аб палітычных праступленьнях на так зв. „Крэсах“ з часу перад 1/IV—1923 году. Аграмадная частка вязьняў з таго часу ўжо выйшла з вастрогаў, калі ня скончыла свайго жыцьця за кратамі.

За тое астануцца ў вастрогах усе арыштаваныя ў працягу апошніх трох гадоў, гадоў, якія ў Заходняй Украіне і Беларусі былі пэрыодам масавых арыштаў.

Далей урад хоча карыстацца „індывідуальнымі памілаваньнямі, данымі на аснове прапазіцыі пракуратуры“. Урад ідзе тут сьлядамі Пілата, які, умыўшы рукі, аддаў Хрыста яго найстрашнейшым ворагам! Той, хто знае пракуратуру „Najjaśniejszej Rzeczypospolitej“ — той можа быць пэўны адносна да яе прапазіцыяў: з тысячы вязьняў выйдуць на волю адзінкі.

Абяцанкамі індывідуальнага мілаваньня ўрад „маральнай рэвалюцыі“ мае надзею здэмаралізаваць палітычных вязьняў, каторым гонар і пачуцьцё салідарнасьці забараняе прасіць „ласкі“.

Ня гледзячы на стараньні п.п. Бартля і Пілсудскага, — прэзыдэнт Мосьціцкі ня будзе мець нагоды ўславіцца сваей вялікадушнасьцяй.

Палітычныя вязьні ня хочуць „ласкі“. Яны дамагаюцца права на волю.

Гэтага самага трэбуюць для іх работніцка-сялянскія масы Польшчы і ўсяго сьвету“.

### Міжпартыйны Камітэт у Львове.

У Львове заложаны „міжпартыйны сэкрэтарыят дзеля барацьбы за амністыю для палітычных вязьняў“. У склад яго ўвайшлі: „Украінская партыя народнай волі“, Украінская група „Впэрэд“, камуністы, жыдоўская сацыял-дэмакратычная партыя (Поалей Цыон).

### Дэлегацыя работнікаў Верхняй Сілезіі ў прэм'ера.

Ад 5 да 12 чэрвеня с. г. ў Верхняй Сілезіі адбылося 18 вечаў у справе звальненьня палітычных вязьняў. Прыймалі ў іх удзел каля 50 тысяч работнікаў. Была выбрана спэцыяльная дэлегацыя, зложаная з 30 асоб, якая зьвярнулася да прэм'ера Бартля з дамаганьнямі:

1) роспуску арганізацыяў фашыстаў і арышту іх правадыроў;

2) звальненьня ўсіх палітычных вязьняў;

3) свабоды арганізацыі, забастовак і свабоды прэсы.

### Францускі камітэт барацьбы за амністыю ў Польшчы пашыраецца.

Да камітэту ўвайшлі новыя сябры—францускія пісьменьнікі: J. Duhamel, K. Vildrac, Mareli, Martinet, Bernard i Lekache.

### Масы Зах. Беларусі—трэбуюць амністыі.

Аб сходах у Зах. Беларусі, на каторых былі прыняты рэзалюцыі з дамаганьнем амністыі, — мы даем кожны раз спэцыяльную справаздачу. Цяпер даведываемся, што ў пасольскі Клюб Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады наплываюць кожны дзень пісьмы з дамаганьнямі амністыі. Усяго прыслана ўжо каля **3 тысяч подпісаў.**

# У Польшчы.

### Сьмерць паэта Каспровіча.

Памёр польскі паэт Ян Каспровіч. Каспровіч паходзіў з сялянскай хаты і ў сваіх творах маляваў жыцьцё і сілу сялянства. З чатырох найвялікшых паэтаў і пісьменьнікаў пакаленьня Каспровіча—Рэмонта, Высьпяньскага, Жэромскага і Каспровіча —ён быў найстарэйшы, але памёр апошні. Усе гэтыя найвялікшыя пісьменьнікі—славілі дэмакратыю і прарочылі панаваньне сялянскай улады ў Польшчы.

### Плян працы ўраду.

„Кур. Поран.“ паведамляе, што зараз-жа пасьля аканчальнага прыняцьця парлямантам законапраектаў аб зьмене Канстытуцыі ды аб паўнамоцтвах урад возьмецца за шпаркае пячэньне дэкрэтаў з моцай законаў. У першую чаргу будзе выданы рад „законаў“ фінансава-гаспадарчага зьместу; пасьля шляхам дэкрэту будзе створана „Рада юрыстаў“ (замест праектаванай правіцай „Рады Стану“), якая будзе папраўляць з боку юрыдычнага, ці папросту рабіць больш граматнымі ды разумнымі „дэкрэтныя бліны“ паноў міністраў. Далей урад сьпячэ яшчэ для нас—„закон аб (ці проці?!) прэсе“. Пасьля пойдуць ужо, як па маслу, закон аб правох чужаземцаў... быць выкіданымі безапэляцыйна за кардон ваяводамі ды старостамі і г. д...

### „Пяст“ трыумфуе.

Пястоўскія газэты — аж захопліваюцца усей працай ураду Бартля-Пілсудскага. Яны пішуць, што „ўрад Бартля толькі праводзе ў жыцьцё праграму, даўно апрацаваную ў ведамай брашуры п. Вітаса—„Часы і людзі“...

Адно толькі яшчэ асталося споўніць ураду Бартля з гэтай праграмы п. Вітаса.—Вось як „папілсудску“ піша аб гэтым „Пяст“:

„Абавязак ураду—яшчэ раз сьвіснуць пугай над галавой лявіцы ды змусіць яе да прыняцьця патрэбных зьменаў у выбарным законе, а... пасьля зрабіць новыя выбары“!

## Абвестка.

Гэтым падаецца да ведама Сяброў Таварыства Белар. Школы, што 8 жніўня 1926 г. адбудзецца

**Надзвычайны Сход Сяброў Таварыства**

ў 4 гадзіны дня ў памяшчэньні пры Віленскай вуліцы № 12—6 дзеля рэарганізацыі Таварыства паводле нова-зацьверджанага Уладамі Статуту Таварыства, г. з. дзеля выбару Галоўнае Управы і Нагляднае Рады.

**Прэзыдыум.**

## Праз 12 гадоў—перад новай вайной!

1 жніўня новага стылю (19 ліпня пастарому). Нямеччына—у адказ на адмову расейскага ўраду спыніць мабілізацыю, скіраваную—у абарону Сэрбіі—проці Аўстрыі,—аб'явіла Расеі вайну. Расею падтрымала Францыя, Францыю—Англія, і т. д... І пачалася—сусьветная—Вялікая вайна...

Як раз 1 жніўня адзін з галоўных герояў гэтай вайны, марш. Фош, у гутарцы з англійскім журналістам, на запытаньне апошняга аб магчымасьці выбуху новай вайны, заявіў паміж іншым: „Ня гледзячы на пануючыя ўсюды мірныя настроі, **выбух новай вайны можа наступіць — у кожын мамэнт**... З дакумэнтамі ў руках магу сьцьвярдзіць, што ў шмат якіх дзяржавах старанна працуюць над удасканаленьнем прыладаў сьмерці... У апошнія часы зроблена гэтулькі новых вынаходаў у гэтай галіне, што **новая вайна будзе без параўнаньня страшнейшая, як вайна 14—18 г.г.**".

Можна сказаць, што сусьветная імпэрыялістычная буржуазія ўжо апошняй вайной падпісала сабе прысуд сьмерці. Але яго выкананьне неяк ёй удалося адцягнуць... Новая вайна пэўна ж будзе рашучым яго выкананьнем прысуду...

---

Калі новы ўрад—пасьля „перавароту"—толькі спаўняе праграму п. Вітаса, дык запраўды-ж нׄяварта было скідаць гэтага мудрага Вітаса ды „тапіць" яго...; на нятонучым караблі ў моры пралітай крыві сялян і работнікаў!

### Дадаткі да пэнсіяў паном афіцэрам.

„Роботнік" зьмяшчае запярэчаньне весткі, быццам праектаваныя дадаткі для паноў афіцэраў адложаны на даўжэйшы час. Дадаткі, дый вельмі значныя, пачнуць выдавацца зараз-жа — ад 1-га жніўня. У канцы газэта дадае, што „сярод цывільных урадоўцаў пануе надзея, што ўрад таксама займецца папраўкай быту дзяржаўных урадоўцаў"...

Ведама-ж: сьпярша — „найдаражэйшая ў Польшчы кроў", а пасьля—таньнейшая. Усё—па чарзе.—Добра, калі наагул—„пануе надзея".

### Забастоўка ў Лодзі.

2 г. месяца адбылося паседжаньне делегатаў ад прафэсыянальных саюзаў „instytucyj użyteczności publicznej".

З прычыны варожага адносіньня другой стараны да мірнай ліквідацыі спору; з прычыны таго, што на прапазіцыі прафэсыянальных саюзаў нат' ня быў дадзены адказ—дэлегаты рашылі аб'явіць агульную забастоўку ў Лодзі.

Забастоўка пачнецца ў чацьвер 5 г. м., а гадз. 8-ай.

Да забастовачнага камітэту прылучыліся і прадстаўнікі работнікаў на „kolejkach dojazdowych". Вестка аб забастоўцы выклікала ў горадзе вялікае ўзварушэньне.

### Сьледзтва ў справе забойства работнікаў пэпээсаўскай міліцыяй мае быць спынена.

Правадыры ППС стараюцца ўсякімі спосабамі затушаваць сваё злачынства, учыненае першага мая над работнікамі. Урад ідзе ім насустрэчу.

Пасол Прыступа (камуніст) ў часе дыскусіі аб паўнамоцтвах для ўраду—выкрыў, што сьледзтва ў гэтай справе мае быць спынена.

### Веча вольнадумцаў—разагнана!

18 ліпня ў Варшаве мела адбыцца веча польскіх вольнадумцаў (інтэлігентаў, спрыяючых справе працуючых мас).

Уласьнік памяшчэньня ў апошні мамэнт адмовіўся пусьціць іх туды,—ясна пад націскам паліцыі. Арганізатары ўжо не здалелі адклікаць веча, і людзі пачалі сходзіцца.

Пешая і конная паліцыя разагнала зьбіраўшыхся, пры чым арыштавалі 47 асоб.

## Заграніцай.

### Радавая нота Польшчы.

Нямецкія газэты пішуць, быццам Чычэрын зьвярнуўся да польскага ўраду з новай нотай, у якой, у сувязі з гуртаваньнем польскіх войск на літоўскай граніцы, трэбуе, каб польскі ўрад заверыў, што ён не мяніцца аружна захапіць Літву, дый наагул—выклікаць якісь аружны канфлікт на літоўскай граніцы.

Газэты паведамляюць, быццам—дзеля падмацаваньня ноты—радавы ўрад адклікаў свае войскі з манэўраў ды трымае іх на пагатове ў Беларусі і Украіне—на ўсялякі выпадак...

Польская прэса піша, што гэта ўсё — нямецкая брахня. Добра, калі так...

### „Шпіёнская арганізацыя ў Румыніі".

Румынская паліцыя (сігуранца) выкрыла „шпіёнскую арганізацыю, працаваўшую на карысьць Радавай Расеі". Цэнтр арганізацыі быў у м. Бэндэрах і падтрымліваў сталую сувязь з разьведкай у Адэсе.

Можа яно і так. Дый нічога дзіўнага: бо-ж ня так даўно ў Парыжу выкрылі так сама шпіёнскую арганізацыю, якая працавала на карысьць... Англіі!

Калі ўсе буржуазныя дзяржавы толькі тое і робяць, што рыхтуюцца да вайны, дык трэба-ж так ці сяк ратавацца добрым суседзям адзін ад аднаго!

### Замах на Прымо-де-Рывэра.

3/VIII ў Мадрыце кінуў штылетам у гішпанскага дыктатара і ката вызвольнай барацьбы рыфэнаў—нейкі чалавек.

Ясна, што гэта помста за кроў працуючых, пралітую Рывэрой.

### Самаабарона ад фашызму.

У палове ліпня адбыўся ў Вене першы міжнародавы зьезд работніцкай самаабароны проці фашызму.

З Нямеччыны, дзе арганізацыя мае 3 мільёны членаў,—учасьнікі зьезду прыехалі спэцыяльнымі паяздамі.

Наладжаны быў велічэзны паход па вуліцах гораду.

Каб пабачыць канец яго, трэба было стаяць на адным месцы 4 гадзіны.

### Канфэрэнцыя англійскіх вуглякопаў.

30 г. м. адбылася канфэрэнцыя дэлегатаў прафэсыянальных саюзаў вуглякопаў Англіі.

Апрацована мэморандум, якое будзе прадстаўлена ўраду. Галоўныя пункты мэморандуму гэткія: 1) прапазіцыя павароту да працы на варунках, якія былі перад забастоўкай, з дадаткам, што ўрад да часу аканчальнага паразуменьня — будзе выплачываць работнікам дапамогі; 2) Паразуменьне мае наступіць па магчымасьці скора і абгаварывацца на ім можа толькі справа заработнай платы. (Рабочы дзень астаецца бяз зьмены).

### Апрос ў спраае забастоўкі.

Канфэрэнцыя дэлегатаў бастуючых ангельскіх вуглякопаў пастанавіла зьвярнуцца да работнікаў з апросам, як адносяцца яны да прынятых канфэрэнцый рэзалюцяў.

## Сойм і Сэнат.

### Зьмена канстытуцыі і паўнамоцтвы ўраду.

У апошнія дні працаваў Сэнат над далейшай „манархізацыяй" польскай Канстытуцыі. Хіена-пястоўская большасьць Сойму значна пашырыла сваімі папраўкамі правы Сэнату, дык гэта дадало яму ахвоты. Сэнат даўно хоча быць роўным з Соймам; цяпер, скарыстаўшы з добрай нагоды, узяў дый „зрабіў" свае законадаўчыя правы ды прывілеі роўнымі соймавым... Нарабіў яшчэ шмат „папраўак"—выключна рэакцыйнага зьместу.

3 жніўня прэзыдэнт падпісаў прынятыя Соймам і Сэнатам законы аб зьмене Канстытуцыі і аб паўнамоцтвах для ўраду, і 4 жніўня абодва законы апублікаваны ў афіцыяльным органе ўраду ў рэдакцыі Сойму.

### Вар'ят у польскім парляманьце.

У часе апошняга паседжаньня Сэнату ў салю ўварваўся ведамы з працэсу польскіх фашыстаў (ППП) „палкоўнік" Горчыньскі, які пачаў крычаць, што яго крыўдзяць ворагі, не даючы ходу зробленым ім новага тыпу бомбам... „Палкоўнік" клікаў марш. Тромпчыньскага ды прэзыдэнта на ратунак. Калі яго вывялі з салі, ён самлеў, а пасьля аказалася, што гэта вар'ят.

Гэта ўжо другі выпадак з вар'ятам у польскім парляманьце: першы быў у Сойме, цяпер у Сэнаце...

---

Рэзалюцыі гэтыя падалі мы ў прошлым нумары. Зводзяцца яны да наступных пунктаў:

1) Вуглякопы вяртаюцца да працы на варунках, якія былі перад забастоўкай;

2) Урад будзе выдаваць нейкі час дапамогу зруйнаваным работнікам;

3) Рабочы дзень ня можа быць прадоўжаны і

4) У найбліжэйшым часе мае быць склікана нарада з прадстаўнікоў абедзьвых старон.

### Маніфэстацыя проці чужынцаў у Парыжы.

Францыя перажывае цяжкі гаспадарчы крызіс. Работніцкая кляса уʻецца ад голаду.

Тымчасам, выкарыстываючы розьніцу валют, зʻяжджаецца з усяго сьвету сюды буржуазія, каб танным коштам гуляць.

На гэтым тле пастаянна адбываюцца ў Парыжы дэманстрацыі проці чужынцаў.

Апошнімі днямі абляяў групу прыездных амэрыканцаў—якісьці работнік. Пасьля некалькіх слоў узнялася бойка.

### Забойства францускага губэрнатара Сірыі.

З Дамаску паведамляюць аб забойстве паўстанцамі францускага губэрнатара Сірыі. Аб кім іменна йдзе гутарка, няведама. Але ў кожным выпадку рэзультаты „перамогі" над паўстанцамі ўжо даюцца французам у знакі...

### Прыгавар у справе мадзярскіх камуністаў.

4 г. м. быў прачытаны Будапэштскім судом прыгавар, якім барцы за Мадзярскую Савецкую Рэспубліку засуджаны нячувана цяжка.

Так Ракошы атрымаў $8^1/_2$ гадоў цяжкай турмы. Райзэнберг 8 гадоў, рэшта ад 3—4 гадоў.

---

„Народная Справа", адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць і дапамагаць сваей газэце.

---

## У дванадцатыя угодкі сусьветнае вайны.

1 жніўня 1914 году, ці роўна 12 гадоў назад нямецкі ўрад імпэратара Вільгэльма II аб'явіў вайну Расеі. Расею падтрымала саюзная Францыя, Францыю—Англія; пачарзе ў вайну ўцягваліся: Японія, Італя, Амэрыка, ня лічучы драбнейшых дзяржаў. Побач з Нямеччынай сталі пад аружжа Аўстрыя, Турцыя, Баўгарыя, ня лічучы круціўшых між коаліцыямі—Румыніі і Грэцыі.

Словам, вайна запаліла ня толькі блізу ўсю Эўропу, але й амаль ня ўвесь сьвет, бо да Англіі далучыліся і ўсе яе дамініі і калёніі.

Вайна, як ведама, пачалася нібы з дробнага здарэньня: нейкі сэрбскі рэвалюцыянэр-незалежнік ці моʻ аўстрыяцкі правакатар, забіў у Сараеве аўстрыяцкага насьледнага прынца. Аўстрыя, якая даўно пачала глытаць, сьпярша ў паразуменьні з Прусіяй і Расеяй, а пасьля ўжо—у згодзе з Нямеччынай, але без падзелу з Расеяй, адну па аднэй славянскія дзяржавы, -- скарыстала з забойства свайго насьледніка, каб аканчальна зваяваць Сэрбію. Расея выступіла на абарону Сэрбіі ды абʻявіла агульную мабілізацыю проці Аўстрыі. Нямеччына ўступілася за Аўстрыю і на адмову з боку расейскага ўраду спыніць мабілізацыю адказала абʻяўленьнем вайны...

Так выглядалі вонкава-гістарычныя факты. Але, як кідаецца адразу ў вочы, усе вялікія дзяржавы так моцна рваліся да вайны, што як—быццам рады былі, што нарэшце дачакаліся добрае нагоды, каб кінуць народныя масы ў яе полымя. Ведама-ж, пры **добрай волі** да міру, было-б лёгка паразумецца ў справе зьліквідаваньня аўстра-сэрбскага канфлікту, але гэтага якраз і яўна не жадала **злая воля** тых сілаў, якія кіравалі ўсім палітычным жыцьцём Эўропы, якія — можна сьмела сказаць—у працягу апошніх 40 гадоў міру толькі й рыхтаваліся да вайны. Дык ведама-ж,—прапусьціць добры прыпадак ня мелі ніякае ахвоты!

---

Якія-ж гэта злыя сілы кіравалі, а моʻ й дагэтуль кіруюць народамі так магутна і ўладна, што маглі ў працяг 6-7 гадоў кідаць на сьмерць, на бойню гэтулькі мільёнаў людзей, руйнуючы гэтулькі красаваўшых краёў, зьніштажаючы столькі створанага народнай працай багацьця? Каб паказаць сьпярша страшэнную, запраўды-ж чартоўскую моц гэтых сілаў, прыпомнім, што нарабіла гэтая „Вялікая" вайна з людзьмі і іх дабрабытам.

„Вялікая" вайна была запраўды-ж найвялізарнейшай з усіх, якія толькі ведае гісторыя. У часе вайны было ўсяго змабілізавана 75 мільёнаў людзей... З гэтых адабраных найлепшых, наймаладзейшых хлапцоў і мужчын, пасланых гэтай дзіўнай „воляй" на бойню, палягло забітымі — больш 10 мільёнаў, цяжка раненых ды астаўшыхся няздольнымі да працы інвалідамі-калекамі на ўсё жыцьцё—6 з чвэрцяй мільёнаў, лёгка раненых—больш за 14 мільён., палонных ды прапала бяз весьці—6 мільён. Апрача гэтага, ад хваробаў ды голаду, у сувязі з вайной і блёкадай, памерла 5 мільён. 300 тысяч. Але яшчэ, з прычыны вайны, разрыву сямʻі і г. д. не дарадзілася за гэты час каля 20 мільёнаў дзяцей. Гэткім чынам, агульны ўбытак насяленьня на сьвеце з прычыны вайны быў каля 35 мільёнаў 300 тысяч людзей...

Дык няўжо-ж гэткай лічбай ахвяр трэба было заплаціць людзкасьці за забойства аднаго аўстрыяцкага прынца?! Ясна, што повад вайны — адно, а яе прычыны—зусім нешта іншае. Але мы яшчэ не далічылі ўсяго, што „дала" вайна. — Як падлічылі тыя-ж амэрыканскія статыстыкі, вайна—разам з яе коштамі і стратамі насяленьня зруйнаваных зямель—каштавала сьвету каля **400 мільярдаў даляраў...**

---

Гэткая страшэнная вайна вельмі працьверэзіла галовы ды праясьніла вочы народам, над якімі так страшэнна—уладна панавала—на іх бяду і гібель—гэта чартоўская „воля"... У выніку прабуджэньня жыцьцёвага інстынкту народаў пачаўся шырокі масавы рух сярод тых, каго дагэтуль маглі гнаць, як стада валоў, на бойню... Першым чынам ад гэтага руху паляцелі з сваіх тронаў: 4 імпэратары (расейскі, германскі, аўстрыяцкі, турэцкі), 6 каралёў, 5 вялікіх князёў і 12 меншых валадароў. Усяго 27 штук -- „манархаў божай міласьцю" заплацілі ці жыцьцём ці толькі тронам за праступленьне вайны. Але манархі — толькі слугі ды прыкашчыкі іншага, шмат больш магутнага пана—таго, хто запраўды выклікае, калі захоча, найстрашнейшыя войны... Гэты пан — **сусьветная імпэрыялістычная буржуазія.**

Сусьветная вайна расчыніла вочы народаў і на гэта. І там, дзе, скінуўшы цароў, народ па-

# Фэлікс Дзержынскі.

(Кароткі жыцьцёпіс).

Дзержынскі паходзіў з нашага краю: ён урадзіўся ў 1877 годзе у Ашмянскім павеце, бацькі паходзілі з дробнае шляхты. Учыўся Дзержынскі ў Віленскай гімназіі і ўжо на школьнай лаўцы выяўляецца яго бунтарскі дух. Казенная школа не задаваляе яго, дома занімаецца ён самаадукацыяй, а, маючы 16 гадоў, кіруе вучнёўскім нелегальным сацыял-дэмакратычным гуртком.

У 1895 г. Дзержынскі ўступае ў літоўскую сацыял-дэмакратычную партыю і пачынае працу сярод рамесьленьнікаў і вучняў. Ен вучыўся парасейску і польску, але дзеля таго, каб мець лягчэйшы доступ да жыдоўскіх работнікаў многанацыянальнае Вільні—навучыўся і пажыдоўску.

Гімназія нічога яму не дае, а толькі перашкаджае ў працы, з 8 ай клясы (у 1896 г.), Дзержынскі выходзіць, пераяжджае ў работніцкі квартал і ад таго часу аж да канца жыцьця ўвесь аддаецца справе барацьбы з царызмам і капіталам.

У пачатку 1897 году партыя пасылае яго, як агітара і арганізатара, у Коўна, дзе ня было ніводнай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі і дзе нядаўна правалілася ППС.

Тут-жа Дзержынскі здаў другі экзамін свае рэвалюцыйнай сьпеласьці. Папаўшыся ў лапы жандармаў, дзякуючы даносу аднаго маладога работніка, якога падкупілі за 10 рублёў — ён трымаўся цьвёрда і быў адпраўлены на 3 гады ссылкі ў Вяцкую губэрнію.

Адтуль у 1899 годзе ён уцек і з'явіўся ўзноў у Вільню, дзе распачаў барацьбу з нацыяналізмам літоўскіх сацыял. згоднікаў. Ня маючы змогі з паліцэйскіх прычын працаваць, Дзержынскі на балаголе едзе пад граніцу, каб перайсьці па другі бок. У пагранічным мястэчку ўдалося яму дастаць мясцовы пашпарт, маючы які, ён адразу вяртаецца назад, толькі ня ў Вільню, а ў Варшаву. Хутка здабывае тут Дзержынскі зьвязкі з работнікамі, аднаўляе арганізацыю сацыял-дэмакратаў, адшчапіўшы ад ППС спачатку шаўцоў, а пасьля цэлыя групы сталяроў, мэталістаў, скурнікаў і пекараў. Партыйная яго клічка ў той час была „Астраном" і „Франэк", акрамя гэтых, ён карыстаўся пасьля яшчэ прозьвішчам „Дзер" і Яцэк.

У 1900 годзе Дзержынскага на сходзе арыштавала ўзноў паліцыя і трымала 2 гады ў вастрозе, спачатку ў Варшаўскай цытадэлі, а пасьля ў Седлецкай турме.

У 1902 годзе высылаюць яго на 5 гадоў у Сібір, аднак па дарозе ён уцек разам з адным с.-р. і выехаў на гэты раз заграніцу.

Пад той час заграніцай, хаваючыся ад царскага перасьледаваньня, знаходзіліся такія відныя прадстаўнікі польскага работніцкага руху, як Роза Люксэнбург, Гышко, Мархлеўскі і Варскі. Дзержынскі адразу здабывае сабе месца 5 правадыра ў заграінчным ядры.

Да студзеня 1905 году ён жыве ў Кракаве, выдаючы партыйны орган „Czerwony Sztandar" і прыяжджаючы ад часу да часу для падпольнае працы ў расейскую Польшчу, як сябра галоўнай управы с. д. Польшчы і Літвы. На адной з гэтых паездак паліцыя ловіць Дзержынскага (1905 год), але, дзякуючы амністыі, праз тры месяцы звальняе.

У 1906 годзе яго пасылаюць дэлегатам на з'езд „Расейскай Сацыял-Дэмакратычнай Работніцкай Партыі" у Стокгольм. Увайходзіць у Цэнтральны камітэт РСДРП. У канцы 1906 году ахранка наскочыла на партыйны сход, на якім быў прысутны Дзержынскі, і ён год сядзіць у турме, звольніўшыся пасьля пад заклад.

У 1908 годзе яго ўзноў арыштоўваюць, а ў 1909 пасьля суда ссылаюць у Енісэйскую губэрнію. Прабыўшы ў Сібіры 7 дзён, Дзержынскі ўцякае і праз Варшаву едзе на граніцу.

Да 1912 году яму ўдалася папрацаваць на свабодзе, пасьля чаго наступае апошні арышт. Тры гады катаргі адбывае Дзержынскі ў Арлоўскім вастрозе, а пасьля пераводу ў Маскву—прыбаўляюць яму яшчэ 6 гадоў. Расейская рэвалюцыя раскавала з кайданаў гэтага чалавека, які прабыў у іх 11 поўных гадоў.

Адразу пасьля выхаду з турмы Дзержынскі аддаў сябе ў распараджэньне бальшавіцкага штабу. Ён яўляецца арганізатарам „Надзвычайнай камісіі для барацьбы з контр-рэвалюцыяй, пад яго кіраўніцтвам быў адбудованы Савецкі транспарт, а апошнімі гадамі ён быў да таго яшчэ старшынёй Найвышэйшай Рады Народнага гаспадарства СССР.

Памёр Дзержынскі 20 ліпня 1926 году ў Маскве, сьмерць наступіла ад параліча сэрца.

# З жыцьця „Грамады".

### Новыя арганізацыі.

68. У вёсцы **Сакі**, Лебедзеўскай гм., Маладэчанскага пав., 21-га ліпня г. г. з'арганізаваны Сакаўскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

69. У м-ку **Наваградку**, Наваградзкага павету, 18-га г. г. з'арганізаваны Наваградзкі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

70. У м. **Лідзе**, Лідзкага пав., 11-га г. г. з'арганізаваўся Лідзкі Гурток Бел. Сялян.-Работ. Грамады.

71. У вёсцы **Студзенец**, Росьскае гм., Ваўкавыскага пав., 1-га ліпня з'арганізаваны Студзенецкі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

72. У фальв. **Ярасьмішкі**, Юрацішскае гм., Валожынькага пав., 20-га г. г. з'арганізаваны Ярасьмішскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

73. У вёсцы **Любанічы**, Цырынскае гм., Наваградзкага пав., 24-га ліпня г. г. з'арганізаваны Любаніцкі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

74. У вёсцы **Зуброў**, Галынкаўскае гм., Гарадзенскага пав., 26-га ліпня г. г. з'арганізаваны Зубраўскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

75. У м-ку **Турэц**, Ярэміцкае гм., Стаўпецкага пав., 18-га ліпня г. г. з'арганізаваны Турэцкі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

76. У вёсцы **Шчарбовічы**, Воленскае гм., Баранавіцкага пав., 25-га ліпня г. г. з'арганізаваны Шчэрбовіцкі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

77. У вёсцы **Падаляны**, Белавежскае гм., Бельскага пав., 25-га ліпня г. г. з'арганізаваны Падалянскі Гурток Белар. Сялян. Работ. Грамады.

78. У вёсцы **Запольле**, Косаўскае гм., Косаўскага пав., 25-га ліпня г. г. з'арганізаваны Запольляўскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

79. У вёсцы **Тарасэвічы**, Вішнеўскае гм., Вялейскага пав., 11-га ліпня г. г. з'арганізаванага Тарасэвічаўскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

80. У вёсцы **Палужы**, Карэліцкае гм., Наваградзкага пав., 24-га ліпня г. г. з'арганізаваны Палужаўскі Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

### Камітэты Гуртноў працуюць што-дня.

**Паведамленьне.**

Гурток Белар. Сялян.-Работ. Грамады ў вёсцы

# Замах на беларускага дзеяча у Горадні.

„Robotnik" № 211 паведамляе:

Уначы з 31 на 1 жніўня каля 1 гадз. на вуліцы Напалеона ў Горадні неспадзявана быў падстрэлены Міхал Гурын, ведамы сацыялістычны беларускі дзеяч.

Стралялі ў яго перад домам, у каторым жыў. Усяго стрэлаў было 8, з іх 2 кулі папалі: адна—ў нагу, другая—ў плячо. Ранены астаткамі сіл даваліокся да Гандлёвага Готэлю, дзе праездам знаходзіўся беларускі пасол Рагуля, з каторым Гурын перад замахам меў канфэрэнцыю і ад яго варочаўся.

Характэрна, што ранены Гурын не пайшоў аж да свае хаты, аж на пастарунак паліцыі, а толькі ў готэль.

Гурын маніўся 1 жніўня выступіць на вечы, скліканым пасламі Тарашкевічам і Валошынам з Беларускай Сял.-Раб. Грамады.

Гурына пасьля агляду перавезьлі ў бальніцу. Стан яго—цяжкі.

На аснове істнуючых даных думаюць, што праступны замах быў зроблены на палітычным груньце.

---

Ад сябе дадаем, што Гурын у свой час быў адным з кіраўнікоў апазыцыі ў камуністычнай партыі Зах. Беларусі. Сядзеў у турме і нядаўна стуль звольнены.

**Хлюпічах**, Баранавіцка пав., на сваім паседжаньні 18 ліпня 1926 г. выключыў з складу сяброў Гуртка Тодара Тарасэвіча, як не пажаданага і шкоднага чалавека. Сьцьвярджаючы пастанову Хлюпіцкага Гуртка, Ц. С. Грамады даводзіць да ведама, што партыйны білет Т. Тарасэвіча за № 415—уняважнены.

# ХРОНІКА.

**Куды кіраваць карэспандэнцыю да паслоў?** З прычыны таго, што ў перарыве паседжаньняў Сойму паслоў нашых ў Сойме няма, усю назначаную для паслоў і клюбу Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады карэспандэнцыю трэба пасылаць у Цэнтральны Сэкрэтарыят Грамады ў Вільні, Віленская вуліца № 12.

**Справа Базыльянскіх муроў.** Ужо некалькі гадоў цягнецца судовая справа паміж польскім урадам і праваслаўнай кансісторыяй аб гмах былага базыльянскага манастыра, у якім, на падставе паразуменьня з праваслаўным духавенствам, памяшчаюцца беларускія культурныя ўстановы — гімназія, музэй, інтэрнат. Акружны суд прызнаў, што ўрад незаконна абвясьціў гэны гмах дзяржаўнай маемасьцяй. Гэтак і дамаганьне ўраду, каб былі выкінены стуль нашыя ўстановы, само сабой адпала.

Аднак, улада не супакоілася на гэтым і падала апэляцыю. 11 жніўня апэляцыйны суд у Вільні будзе гэту справу разглядаць.

Які будзе прыгавор, нет ведама.

Справу гэтую бараніў у акружным судзе ведамы абаронца ўсіх пакрыўджаных адвакат Врублеўскі, які год назад памёр.

**З Выдавецкае нівы.** Істытут Беларускае Культуры ў Менску выпусьціў у сьвет кэткія выданьні: „Працы глебазнаўчае канфэрэнцыі", „Музычныя тэрміны" і „Інфармацыя аб дзейнасьці Інбелкульту".

Цэнтральнае Бюро Краязнаўства выпусьціла №№ 2—3 і 4—5 журнала „Наш Край" за 1926 год.

У Коўні пачала выхадзіць беларуская часопісь „Покліч".

У Рызе Т-ва Беларусаў-Выбаршчыкаў выпусьціла ўжо 14 кніжачак „Бібліатэкі Беларуса-Выбаршчыка".

**Ахвяры ў Музэй ім. Ів. Луцкевіча.** Урад Бел. Навуковага Т-ва гэтым дзякуе за ахвяры для Музэю: 1) грам. Шыроцкаму ў Вільні—за пятлюраўскі крыж; 2) грамадзянам, зложыўшым у Белар. Каап. Банку 12 розных медных манэт і не пакінуўшым свайго прозьвішча; 3) Ю. Шустэру ў Вільні—за 6 медн. манэт; 4) Аляксандру Мацейчыку ў Рудаўлянах (у Горадз. пав.)—за акамянеласьць і срэбную манэту.

**З Вільні ў Менск.** Праз станцыю Загацьце 3 жніўня прайшоў першы таварны поезд з Вільні ў Менск, на падставе паразуменьня паміж польскім і радавым урадамі аб беспасрэдным таварным руху на гэтай лініі. У той-жа дзень прыйшоў першы поезд з Менску.

З Польшы павязьлі 19 вагонаў каменнага вугальля. З СССР прывезьлі руду.

**Папраўка.** У празароцкай адозьве да сяброў Грамады пададзены абмылкова подпіс: замест „Міхал Савіцкі" павінна быць „Міхал Саковіч".

**Афіцыяльны курс грошы на 6-га жніўня.** Даляр — 8 зл. 98 гр. Залаты рубель — 4 зл. 63 грошы.

6. VIII. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 9,00. Чырвонец 45 зл.

---

чуў сябе на сілах, ён зваяваў і зьніштожыў і сваю „радзімую" буржуазію.

Вось найбольш важны пазытыўны рэзультат вялікай імпэрыялістычнай вайны. Працоўныя масы народаў, замучаных вайной, у ўзаемным паразуменьні і згодзе пачалі цяжкую барацьбу з запраўднымі вінавайцамі вайны. А першыя пабеды ў гэтай барацьбе, якія мы бачылі сваімі вачыма,—залог аканчальнай перамогі над гэным сусьветным жываедам.

Але сусьветная буржуазія ня думае зусім складаць аружжа, ані адмаўляецца ад панаваньня над народамі. Наадварот: яна ізноў пагражае ім новай, дый, можа, ня менш страшнай вайной. У гэтым ня можа быць ніякага сумляваньня.

Возьмем наўдачу некалькі фактаў з апошніх газэт.

Якраз у дзень угодкаў вайны адзін з герояў яе, францускі фэльдмаршалак Фош, заявіў, што „выбух вайны можа наступіць у кожны мамэнт"...

У англійскіх газэтах пішуць, што ўрадам Англіі апрацаваны праект абароны Лёндану ад ядавітых газаў.

У Амэрыцы, якая вонках іграе роль нейкага асаблівага „міратворца", узапраўднасьці скрыта і тайна вядуцца падрыхтаваньні да вайны ў такім маштабе, аб якім згаладалая Эўропа ўжо можа толькі лятуцець... у Амэрыцы, як пішуць газэты, істнуюць цэлыя вялізарныя месты, якіх толькі няма ні на якой гэаграфічнай карце! Бо гэтыя месты—„кансьпіратыўныя", пабудаваныя амэрыканскім генаральным штабам—спэцыяльна для вырабу і хаваньня прыладаў вайны. Нядаўна страшэнны выбух, які трываў цэлых два тыдні ў гэткім „тайным месьце", паказаў, у якім размаху ідзе гэтая „фошава праца" ў Амэрыцы. На гэтыя збраеньні Амэрыкі з усіх сілаў адказывае Японія, у бок якой кіруюцца ў першую чаргу гэтыя збраеньні.

Мы ня будзем ужо пералічаць розных нязьлічаных вогнішчаў будучае вайны, розных выбуховых цэнтраў у Эўропе. Адзначым толькі ў канцы новую асаблівасьць у цяперашніх абставінах і мэтах будучае вайны—у параўнаньні з папярэдняй. Новая вайна мае быць і будзе — ня толькі вайной дзяржаўных жываедаў між сабой—за панаваньне над рынкамі ды жывымі населенымі тэрыторыямі: новая вайна будзе адначасна і магутнай вайной і—між імпэрыялістычнай буржуазіяй і сусьветнай арміяй працоўных. Калі Амэрыка мае на мэце, як ворага, Японію, такога-ж жываеда, як яна сама, дык Англія ставіць справу будучай вайны значна шырэй. Англія рыхтуе новую коаліцыю — ужо ня проці „нямецкага імпэрыялізму", які канкураваў да вайны з яе панаваньнем на сусьветным акіяне, але — з новай сілай арміі працоўных усяго сьвету, якая—на чале з СССР—запраўды пагражае самаму істнаваньню яе самай, як—галоўнага павадыра сусьветнага імпэрыялізму.

Ці будзе гэта апошняя вайна запраўды-ж апошняй, гэта будзе залежаць ад таго, хто пераможа ў ёй: ці буржуазія, ці працоўныя масы. Ад саміх працоўных асаў залежыць, ці будзе канец войнам навек. Дык усьведамленьне ды ўзмацненьне гэтых працоўных народаў у барацьбе з буржуазіяй усяго сьвету—найлепшая гарантыя проці праліцьця крыві.

# Як добра у вастрозе!

Пракурорскі Урад, відаць, у зьвязку з усё пашыраючымся рухам на карысьць звальненьня з вастрогаў палітычных вязьняў, рашыў наладзіць візытацыю ў турме на Лукішках і паказаць, як там „добра сядзець“!

Запраўды, ведама-ж, не работнікаў, не таварышоў пасаджаных, ня сем'і іх, каторыя месяцамі ня могуць дабіцца дазволу на пабачаньне, нат не адвакатаў, якія на дзеле, у часе судовых распраў, паказалі сваю бесстароннасьць,—а ўладу: ваяводу Рачкевіча, вышэйшых судовых чыноўнікаў, прадстаўнікоў рэакцыйнай і прадажнай прэсы і.... біскупа Міхалькевіча.

Адміністрацыя турмы мыла, чысьціла камэры, лепш адзела вязьняў і г. д., бо павядомлена яна была наперад аб прыходзе дарагіх гасьцей.

Як і трэба было чакаць пры гэткім складзе візытацыі,—знайшла яна, што „все благополучно“ сауссім, як за царскіх часоў. „Госьці“ прайшлі па турме, біскуп адправіў імшу, у часе якой у казаньні разводзіўся аб любві да бліжняга, а пасьля ўся кумпанія сабралася „на гарбатку“ ў начальніка вастрогу, якому даручана выўляць на дзеле гэную „любоў“ буржуазнага грамадзянства да барацьбітаў за лепшую долю працоўных....

Прысутны на візытацыі карэспандэнт манархістычнага „Słowa“, вельмі хваліць зупу, якую ядуць вязьні: „Ого,-кажа ён, — папробавалі-б Вы, што за смак!... саланінка, бульбачка... Трэба было папробаваць“.

А побач з гэтым чорным на белым стаіць, што на ўтрыманьне вязьняў даюць 41 грош у дзень!

Пражывi за 41 грош у дзень у горадзе, дзе прадукты ў некалькі разоў даражэйшыя, як на вёсцы!

Прыймі пад увагу яшчэ й тое, што гэта турма, дзе бог і пан—„dozorca“, які, як сьцьвярдзіла нат соймавая камісія, вельмі часта „жывіцца“ на кошт вязьняў....

Усё ў парадку; а вось, як сьцьвярджае візытацыя, у апошнім годзе памёр адзін вязень на сухоты. Ці мо' гэта таксама ад таго, што аб'еўся сальцам і бульбай?!

Ніхто з прысутных на візытацыі ня меў ніякіх уваг, а самі-ж яны сьцьвярдзілі, што больш, як 500 людзей сядзяць гадамі ў сьледчым арышце і ня могуць дачакацца суда! Гэта — беззаконьне і гвалт, аб якім візытацыя, п'ючы гарбатку, саўсім не гаварыла...

Слава табе, буржуазная справядлівасьць і буржуазная праўда! Грамадзянін.

# Карэспандэнцыі.

## Здраднікам будзе горача...

(Піншчына).

Мы, сяляне вёскі Туляцікі, Ставецкай гм., сабраўшыся 12./VII., заяўляем:

У часе выбараў у польскі Сойм мы аддалі свае галасы за партыю ППС (Польская Партыя Сацыялістычная) думаючы, што яна будзе бароцца за зямлю, процiў падаткаў, за родную школу, бо ўсё гэта яна абяцала.

Цяпер мы відзім, што ППС ідзе з абшарнікамі ды капіталістамі, што яна ашукала працоўныя масы.

Пастанаўляем аднагалосна за партыю гэту больш на галасаваць і гнаць яе вон з вёскі, каб больш і сьледу ня было ашуканцаў ды згоднікаў.

Такую-ж самую пастанову прынялі сяляне і вёскі Паўтаранавічы, гм. Гнойшчыцы, Пінскага пав.

## Зьдзекі.

(Двор Вакштаўляны, Гарадынскай гм., Баранавіцк. пав.)

400 дз. добра выробленае сялянамі зямлі—узялі ў арэнду панкі Андрушкевічы (4-х братоў), якія мелі у Расеі свой уласны двор, але у 1919 г., прасьледаваныя мяйсцовай люднасьцяй, кінулі яго і ўцяклі ў Польшчу, дзе хутка знайшлі сабе працу ў жандармэрыі. Відаць, на гэтай службе не забываліся яны аб сабе, бо цяпер зрабіліся арандатарамі і даволі заможнымі. У зьдзеках над беднатой арэндатары дайшлі да таго, што некаторым сялянам не заплацілі яшчэ ад вясны заробленых грошаў; парабкоў змушаюць працаваць у сьвяточныя дні, а ардынарыі не даюць ім па два, па тры месяцы. Тых-жа работнікаў, якія рашуча дамагаюцца свайго, пратэстуюць,—панкі б'юць, а пасьля праганяюць з работы. У гэткіх выпадках прагнаны ніколі нічога не атрымоўвае за сваю папярэднюю працу. Вось адно здарэньне, якое мела месца 11./VII. 1926 г.

Адзін з арэндатараў, Кароль Андрушкевіч, загадаў свайму парабку Канст. Купцэвічу працаваць у нядзелю. Парабак адмовіўся. Тады раззлаваўшыся панок паклікаў свайго брата Болеслава і абодва страшэнна зьбілі непаслушнага парабка. Залітага крывёю Купцэвіча прабавала бараніць яго матка—кабета ўцякку, — але яе спаткала тое, што й сына: арэндатары павалілі яе і, схапіўшы за валасы, цягалі па зямлі і білі. Пасьля гэтага Купцэвічу спакойра сказалі, каб больш на работу ня йшоў, бо грошай не атрымае. „Але-ж аддайце тое, што я ў вас зарабіў!“ — просіць парабак. „Мы табе ўжо зплацілі!“ — адказалі былыя жандары і пайшлі дамоў.

Так застаўся бедны парабак бяз хлеба і бяз працы—будзе сядзець з паўгода і чакаць, пакуль адбудзецца ў гэтай справе суд. А яшчэ ня ведама, ці выйграе... Ярашэвіч.

## Улада памагае панам устрайваць забавы.

(Стаўпецкі пав).

І так мы замучаны рознымі натуральнымі павіннасьцямі,—розным важэньнем пяску для засыпаньня рэчак,—а яшчэ мусім памагаць паном забаўляцца. Асабліва душыць нас абшарнік Радзівілл, які ўводзіць паншчыну.

Так 25-га ліпня сёлета гэты Радзівілл устроіў аблаву на ваўкоў. Пры помачы ўлады (старосты і паліцыі) сагналі, ня глядзячы на пільную пару, акалічных сялян на загоншчыкаў, а самы гулялі ў паляўнічых.

Наля-Радзівіллаўскі.

## Папы і праца.

(Кобрынь).

У м. Кобрыні рэмантуюць сабор, кідаючы на гэта тысячы злотых, вырučаных з прадажы царкоўнай зямлі. Работнікі працуюць там па 9½ — 14 гадз. у дзень. Калі работнікі пачалі пратэставаць проці 10 — 14 гадзіннай працы ды выступілі з жаданьнем 8 гадзіннага дня, кіраўнік работ пачаў у сьвятым месцы гэтак лаяцца, што пісаць нельга.

Пераканаўшыся, што лаянка не памагае, кіраўніцтва работы зьвярнулася да паліцыі, абвінавачваючы абаронцаў 8-гадзіннага дня працы ў камунізьме. Бачучы-ж, што і паліцыя ня можа змусіць да бясплатных надлічбовых гадзін, духоўныя настаўнікі, карыстаючыся з неарганізаванасьці рабочых, выгналі ад працы праваднікоў, а застаўшыяся, хаця і неахвотна, далей цягнуць папоўскую лямку, пацешаны папамі і царкоўнымі ўжэндмкамі тым, што для Бога ня грэх працаваць і 14 гадзін.

Ад сябе пытаюся папоў, дзякоў, старастаў і т. п. „сьвятых“ урадоўцаў: чаму-ж яны дзеля Бога ня лезуць на рыштаваньне ды не працуюць там, а жаруюць на працы другіх? Няхай-бы папрабавалі скрабаць сьцены ды столь: спэцыяльнасьці ня трэба!

Работнік.

## Пошта.

(Кобрынь).

Кірмаш. Людзей хмары. Бягуць, сьпяшаць. Стараюцца хутчэй залатвіць свае інтарэсы і паехаць дамоў, бо пара гарачая, у аднаго сена, у другога жыта і г. д.

У паштовым урадзе поўна, — нельга павярнуцца. Але чыноўнікаў ня рупяцца, ім сьпяшаць няма куды, памаленьку прыймаюць лісты, або грошы. Б'е 11 гадзіна, пры ваконцы, дзе адбываецца прыймо заказных лістоў, людзей усё больш ды больш. Вельмі марудна адыходзяць па адзінцы і ўздыхнуўшы бягуць да ваза і дамоў. Прабіла гадзіна 12, ваконца зачыняецца, са славамі „przyjść o godzinie 3“.

Уся пошта працуе, а прыймо заказных устрымоўваецца да гадзіны 3. Але селянін чакаць ня мае часу, трэба дамоў, дык пачынаюцца просьбы. Нарэшце кілечны служаць „зьлітуецца“ ды скажа: „Idźcie do okienka telegraficznego, tam przyjmię za osobną dopłatę“.

Таўпа прэцца туды. Лісты прыймаюцца жвава і... за кожны, апрача 46 грашоў значка, трэба даплачваць яшчэ 30 грошаў грашыма. І гэтак кожны дзень. Зарабoтак добры. Дзярэ дзяржава, дзяруць і дзяржаўныя чыноўнікі Беларус.

## Беларускі спэктакль у Глыбокім.

(Дзісеншчына, м. Глыбокае).

17./VII. быў пастаўлены тут спэктакль-вечарына на карысьць абдзіроўцаў Беларускай Гімназіі ў Глыбокім з наступнай праграмай: 1) камэдыя Фр. Аляхновіча „Пан Міністар“, 2) „Лявоніха“ на сцэне і 3) гульні на салі. Загадзя былі расклееныя пекна намаляваныя мастаком Язэпам Драздовічам афішы. У дзень самага спэктаклю прыбыў з Вільні аўтар п'есы і ўзяў на сябе ролю „Пана Міністра“. Не зважаючы на пільніцу жніва і сенаваньня, наплыў грамадзянства на вечарыну, як з Глыбокага, так і з яго ваколіц быў надта вялікі,—саля была перапоўнена да цеснаты. Хаця некаторыя артысты аматары гулялі першы раз на сцэне, наагул спэктакль вельмі ўдаўся.

Пад час гульні з салі на сцэну сыпаліся букеты кветак. Ня меншае ўражаньне зрабіла, двойчы на bis вызваная „Лявоніха“. Танцавалі тры пары пад гукі ўласнага струннага аркестру. Пасьля гэтага распачаліся гульні на салі. Глыбачанін.

## Нам пішуць з вёскі што:

У м. Сарны сабраўшыяся 10. VII. ў ліку 58 работнікі—вынясьлі гэтакую рэзалюцыю:

1) Хаця партыя ППС (Polska Partja Socjalistyczna) хваліцца сваімі ўплывамі сярод насяленьня ў нашай ваколіцы, сьцьвярджаем, што такіх уплываў яшчэ ня мае, апрача некалькіх чыгуншчыкаў, якія, баючыся запісацца ў іншую пртыю, астаюцца ў ППС — ніхто іншы да яе не належыць;

2) пратэстуем проці чутак, быццам існуюць тутка камітэты ППС на вёсцы і што сяляне вераць ППС. Наадварот. Гэтая партыя так аскандаліла сябе, што ёй ніхто не верыць!

У м. Баранавічах бурмістр Дэмбінскі 28 г. м. так прывітаў работнікаў, што брукуюць вуліцу: „пся ваша крэв!... цож так поволне працуеце, лобузы“?!...

# Стыпэндыі для беларускіх вучняў.

## (ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ).

Таварыства Беларускае Школы ў Вільні, якое ўтрымлівае Віленскую Беларускую Гімназію, гэтым даводзіць да ведама беларускага грамадзянства, што ў наступным 1926—1927 школьным годзе пры вышэй азначанай гімназіі адкрываюцца 15—20 стыпэндыяў для бяднейшых, але здольных да навукі вучняў-хлапцоў. Стыпэндыя забясьпечвае поўнае ўтрыманьне: кватэру, ежу, адзеньне і плату за навуку.

Аднычасна Т-ва зьвяртаецца на мясцох да беларускае інтэлігенцыі, наагул сьвядомага грамадзянства з просьбаю, каб далі ведаць Таварыству аб здальнейшых беларускіх бедных дзяцей-хлапцох і сіратах, якія ня могуць вучыцца на свой кошт, а іх бацькам і апякуном растлумачыць і парадзіць, каб аддавалі сваіх дзяцей у навуку на стыпэндыю ў Віленскую Беларускую Гімназію.

Агульныя варункі прыйма ў гімназію абвешчаны ў газэце „Народная Справа“ № 4 ад 4 г. жніўня.

Заявы скіроўваць па адрасу: Вільня, Вострaбрамская 9, Дырэкцыя Беларускай Гімназіі.

Галоўная Управа Т-ва Бел' Школы.

Бурмістр па-хамску зьвярнуўся да работнікаў з тэй прычыны, што ня ўсе яму досыць нізка пакланіліся!

У м. Юрацішках паліцыянт Маеўскі, выяжджаючы ў одпуск, забраў з сабой гаспадыню, у якой жыў, а яна ўзноў узяла з сабой 300 зл. мужа ды вопратку, пакідаючы яму двое дзяцей.

У Пастаўскім павеце па ўсіх гмінах робяць сьпіскі, хто сколькі і якіх атрымоўвае газэт і іншае літэратуры.

У вёсцы Муцьвіцы, Пінскага павету, поп, умовіўшыся з жыхарам Арцёмам даць шлюб яго сыну за 100 зл.,—у царкве патрабаваў яшчэ пяць. Селянін ня меў, дык „ацец духоўны“ гэтак адказаўся: „Вон бандыты-бальшавікі! тут не бальшавіцкае права, каб змушалі нас вянчаць дарма“! (100 злотых, на якія ўмовіліся і якія поп узяў — ён не палічыў тады!).

Прысутныя былі вельмі абураныя і шмат хто пакляўся больш не паказываць носу ў царкву.

# Паштовая скрынка.

Гр. „Навічну“ і „Шуту“. Вашы вершы не падходзяць. Пісаць вершам наагул вельмі цяжка. Папрабуйце прысылаць звычайныя карэспандэнцыі, апісваючы выпадкі, ды працуйце над паляпшэньнем вершаў. Параўнайце свае з тымі, каб-б. што у нас друкаваліся, і пабачыце, як, пакульшто, слаба ў Вас выходзіць.

Гр. „Адному з маладых“. Ваша адозва да моладзі не падходзіць. Цяпер у „Грамадзе“ стаіць пытаньне, як арганізаваць моладзь. Вось Ваша энэргія і прыгадзіцца на гэта.

**Атрымана:**

Ад:—Базыля Шышкова, Пятра Будзькі, Андрэя Антановіча, Уладзіміра Петкі, Міхала Пяткевіча, Аляксандра Грэся, Язэпа Касяровіча, Сьцяпана Палейкі, Уладзіміра Агапончыка, Піліпа Хмура, Аляксандра Руткоўскага, Рыгора Козіка, М. Паўлоўскай, Мікалая Дычка, Аляксея Амельяновіча, Яна Літвіна, Яна Шунэлькі, Паўла Мякіша, Е. Казакевіча, Канст. Ціхановіча, Канст. Галубовіча, Уладзіміра Селецкага, Яна Грышля, Антона Александровіча, Міхала Сурмача, Марціна Вішэйкі, Язэпа Кашэеда, Захара Босага, Ігната Ігнацюка, Антона Гардзея, Яна Юкавіча, Рамана Валаха, Яна Сянкевіча, Мікалая Пацеюка, Дм. Субача, М. Дзядзілы, Язэпа Малчана, Яна Сайковіча—па **1 зл. 50 грош.**

Ад: — Юр. Мацука, Сьцяпана Гацылы, Міхала Мальцава, Д. Марчука, Базыля Сявашкі, Яна Семухі, Сьцяпана Нерашчука, Аляксандра Каўбаскі, Сьцяпана Зелянеўскага, Базыля Шурубейкі, І. Давідовіча, Сідаровіча, М. Марчука, Яна Каншавіка, Сымона Камісарава—па **2 злотых.**

Ад:—Яна Тадаровіча, Уладыслава Гарбача, Міхала Казарэза, Францішка Валынца, Адольфа Воўка—па **1 злотаму.**

Ад:—Мікалая Палуянычка, І. Дзямешкі, Аляксандра Плаксы—па **2 зл. 50 грош.**

Ад:—А. Фрыдмана, М. Зенькевіча, Яна Баканача, Яна Качаргіна, Уладзіміра Каляды, А. Кішкеля, Канст. Соські, Андрэя Пучынскага, Уладзіміра Ваўкавыцкага, Сымона Ляўковіча, Яна Горскага, Пятра Пуні, Антона Мажэйкі, Базыля Жыгаліна, Бел. Вуч. Курсаў у Радашкавічах, Жука, кс. М. Барысаўскага, Базыля Пецюка, Мікалая Віркі, Марты Самолік, Рыгора Былінскага, Пятра Верацiны, Паўла Жыбуля, Міхала Лісоўскага, Яна Сьцепановіча, М. Міхалькевіча, Уладыслава Навіцкага, Б. Выркі, Канст. Канцявы, Міхала Чэрпана, Казіміра Антухевіча, Губарэвіча, Н. Еўновіча — па **3 злотых.**

Адказны-Рэдактар: Т. Крачына. Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22. Выдавец пасол на Сойм П. Мятла.